УДК [902:069.02](476)

*В. Л. Лакіза*

# АБ МАГЧЫМАСЦІ СТВАРЭННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ АРХЕАЛАГІЧНЫХ МУЗЕЯЎ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ *

*Ідэя стварэння на тэрыторыі Беларусі археалагічных музеяў пад адкрытым небам — даволі новая з’ява для археалагічнай навукі і музейнай справы краіны. На жаль, да гэтага часу на Беларусі, пакуль што, не створана ні аднаго такога музея. Сёння на Беларусі існуе некалькі ўнікальных археалагічных комплексаў, якія могуць выкарыстоўвацца для стварэння археалагічных музеяў пад адкрытым небам.*

*На базе разнастайнай гісторыка-культурнай (археалагічнай) спадчыны, якая захавалася на тэрыторыі Аўгустоўскага канала, можна распрацаваць канцэпцыю, стварыць і спрыяць пачатку працы «Археалагічнага музея пад адкрытым небам» — як асноўнай навукова-практычнай і турыстычнай «пляцоўкі» Гродзенскага рэгіёну.*

*К л ю ч о в і  с л о в а: археалагічных музеяў пад адкрытым небам, Белавежская пушча, Аўгустоўскы канал, археалагічна спадчына*

Ідэя стварэння на тэрыторыі Беларусі археалагічных музеяў пад адкрытым небам — даволі новая з’ява для археалагічнай навукі і музейнай справы краіны. На жаль, да гэтага часу на Беларусі, пакуль што, не створана ні аднаго такога музея. У асобных рэгіёнах дзейнічаюць толькі «археалагічныя рэзерваты» эпохі сярэдневякоўя (г. Брэст — «Старажытнае Бярэсце»; г. Гродна — «Ніжняя царква»; г. п. Тураў — гісторыка-археалагічны комплекс «Старажытны Тураў»), вядзецца праца па будаўніцтву новага музея на плошчы верхнепалеалітычнай стаянкі Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці, а таксама вядомы этнаграфічны музей народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах (скансэн) і музей валуноў у Мінску (мал. 1).

Між тым, распрацоўка праектаў па стварэнню, будаўніцтву і функцыянаванню музейных комплексаў пад адкрытым небам даволі распаўсюджаная і папулярная з’ява для шэрагу еўрапейскіх краін. Напрыклад, археалагічныя музеі пад адкрытым небам («археалагічныя паркі», «археалагіныя рэзерваты», «археалагічныя скансэны») паспяхова дзейнічаюць у Літве, Расіі, Украіне, Францыі, Нідэрландах, Швецыі, Даніі, Нарвегіі, Ісландыі, Фінляндыі, ЗША, і інш. Яны ствараюцца як на плошчы ўжо вядомых археалагічных помнікаў з выкарыстаннем выяўленых і закансерваваных старажытных аб’ектаў, так і на так званых «чыстых» (без археалагічных паселішчаў) тэрыторыях, але вельмі зручных для развіцця турыстычнай справы. Напрыклад, толькі ў нашых бліжэйшых суседзяў, на тэрыторыі Польшчы, Літвы, Украіны існуе звыш дзесяці разнастайных музеяў, пабудаваных непасрэдна на месцы археалагічных помнікаў. Вядомымі і актыўна наведваемымі турыстамі з многіх краін з’яўляюцца археалагічны музей пад адкрытым небам у Біскупіне на плошчы гарадзішча жалезнага веку, музей-скансэн на тэрыторыі неалітычных крэмнездабываючых шахтаў у Кшэмёнках Апатоўскіх, прыродна-археалагічныя рэзерваты «Szczekotowo» у Белавежскай пушчы, «Krzemianka» у Кнышыньскай пушчы, дзе для агляду прапаноўваюцца раннесярэдневяковыя курганы і старажытнае месца здабычы крамянёвай сыравіны (Польшча), археалагічны комплекс Кернава на плошчы гарадзішча жалезнага веку і эпохі сярэдневякоўя (Літва) [Borkowski, 2000, s. 10—17; Brzeziński,

* Артыкул падрыхтаваны ў рамках выканання праекта БРФФД—ДФФДУ № Г11К—133 «Палеоэканоміка насельніцтва лясной зоны Украіны і Беларусі: археалагічныя рэканструкцыі і мадэляванне» (2011—2013 гг.).

© В.Л. ЛАКІЗА, 2013

2001, s. 112—115; Piotrowski, 2000, s. 20—27; Zalewski, 2000, s. 18, 19].

Адзначым, што сёння і на Беларусі існуе некалькі ўнікальных археалагічных комплексаў, якія могуць выкарыстоўвацца для стварэння архелагічных музеяў пад адкрытым небам [Абухоўскі, 2008, с. 131—148; Белавежская пушча, 2009; Зямля сілы, 2009; Лакиза, 2009, с. 20—22; Лакіза, 2010, с. 35—45] (мал. 1).

Адзін з іх — на тэрыторыі Нацыянальнага парка «Белавежская пушча» каля в. Камянюкі Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці — адміністрацыйнага і галоўнага турыстычнага цэнтра Белавежскай пушчы. Тут, у ваколіцах вёсці існуе цэлы комплекс з 12 старажытных паселішчаў, якія ілюструюць усе этапы засялення і асваення тэрыторыі Белавежскай пушчы ад з'яўлення першых паляўнічых на паўночнага аленя да сучаснасці [Белавежская пушча, 2009; Зямля сілы, 2009; Лакиза, 2009, с. 20—22; Лакіза, 2010, с. 35—45].

На плошчы археалагічных паселішчаў Камянюкі 1, 2, 3, выкарыстоўваючы прыродныя ландшафты басейна р. Лясная Правая, пяшчаныя ўзвышшы і тэрасы, абапіраючыся на праведзеныя навуковыя даследаванні можна аднавіць асаблівасці тысячагадовага жыцця і быта першабытных людзей, раскрыць адметнасці іх матэрыяльнай і духоўнай культуры. Дакладныя гістарычныя рэканструкцыі дапамогуць выразна паказаць тапаграфію і планіграфію старажытных паселішчаў, характар домабудаўніцтва, узровень камнеапрацоўкі, асаблівасці вырабу разнастайных прыладаў працы, вырабу посуду ці ганчарства, ткацтва, металургіі і металаапрацоўкі, а таксама іншых першабытных і сярэдневяковых промыслаў. Пабудовы эпохі мезаліту (мал. 2, *1*), неаліту, бронзавага веку (жытлы, гаспадарчыя і культавыя збудаванні), адноўленае гарадзішча жалезнага веку, жылыя дамы і цэлыя вуліцы жыхароў ранняга сярэдневякоўя — гэта толькі частка таго, што праноўваецца стварыць у будучым «Археалагічным музеі пад адкрытым небам» [Лакиза, 2009, с. 20 — 22; Лакіза, 2010, с. 35—45] (мал. 2).

Напрыклад, на тэрыторыі паселішча Камянюкі 2 можна рэканструяваь неалітычную жылую пабудову канца III тыс. да н. э. Менавіта ў такіх наземных прамавугольных будынках пражывала насельніцтва кола культуры шнуравой керамікі, якое даволі актыўна асвойвала тэрыторыю сучаснай Белавежскай пушчы (мал. 2, *4*). Унутраную прастору даволі вялікай хаты можна раздзяліць на два раздзелы і выкарыстоўваць як для дэманстрацыі асаблівасцей быта нашых далёкіх продкаў, так і для паказа методыкі археалагічных даследаванняў праз закансерваваныя ўчасткі культурнага пласта і аб'ектаў у ім. Вакол неалітычнай хаты можна пабудаваць загоны для хатніх жывёл, размясціць агнішчы, крэмнеапрацоўчыя і ганчарныя майстэрні.

Адноўленая на тэрыторыі паселішча Камянюкі 3 «вёска бронзавага веку» павінна стаць яшчэ больш цікавым аб'ектам, які ілюструе асаблівасці домабудаўніцтва II тыс. да н. э. (мал. 2, *2*). Тут, на ўзвышшы на ўскрайку лесу можна стварыць цэлы комплекс з некалькіх разнастайных па форме і прызначэнню жылых, гаспадарчых і культавых пабудоў тшцінецкай культуры, у арэал якой ўваходзіла і тэрыторыя сучаснай Белавежскай пушчы.

Асаблівае месца ў «Археалагічным музеі пад адкрытым небам» на тэрыторыі Н П «Белавежская пушча» павінна быць адведзена пад рэканструкцыю гарадзішча ранняга жалезнага веку Камянюкі 1 (мал. 2, *6*). Пасля дадатковых навуковых раскопак яго тэрыторыі неабходна падсыпаць, умацаваць, аднавіць вал і абарончыя драўляныя сцены, пабудаваць драўляную дарогу («маставую»), уязную браму і пад'ёмны мост над ровам з вадой. Унутры гарадзішча, дыяметр якога каля 50—60 м, можна аднавіць вуліцы з жылымі і гаспадарчымі пабудовамі. Тут жа можна паказваць некаторыя старажытныя рамёствы, тэхналагічныя і вытворчыя працэсы, у першую чаргу здабычу і выплаўку жалеза ў спецыяльных горнах-печах, выраб жалезных прыладаў і зброі.

Непадалёку ад гарадзішча можна аднавіць асобны падворак жалезанага веку (насельніцтва пшэворскай культуры), а таксама жылую пабудову ранніх славян (мал. 2, *7, 8*). Усе жылыя і гаспадарчыя пабудовы будучага музея павінны ўвесь час функцыянаваць, «жыць». Некаторыя з іх можна выкарыстоўваць для размяшчэння міні-кафэ, у меню якіх ёсць напоі і стравы, прыгатаваныя па старажытных рэцэптах (першабытная кухня), міні-магазінаў з продажам разнастайных сувеніраў, і, нават, міні-гатэляў з першабытнымі ці сярэдневяковымі ўмовамі для пражывання.

Яшчэ адным перспектыўным месцам для стварэння новага «Археалагічнага музея пад адкрытым небам» з'яўляецца тэрыторыя Аўгустоўскага канала ў Гродзенскім раёне Гродзенскай вобласці, у першую чаргу плошча стаянкі каменнага веку Нямнова 1 [Абухоўскі, 2008, с. 131—148] (мал. 1). Абгрунтаванне праекта будаўніцтва тут такога музея можа выглядаць наступным чынам.

Тэрыторыя Аўгустоўскага канала, яе беларуская частка, доўгі час заставалася своеасаблівым «белай плямай» на археалагічнай карце Беларусі, адным з нешматлікіх куткоў Гарадзеншчыны, куды практычна не ступала нага археолага. Між тым, фізіка-геаграфічныя асаблівасці гэтага рэгіёну, яго параўнанне з суседнімі польскімі, ужо абследаваць тэрыторыю з вялікай колькасцю помнікаў археалогіі, дазваляла археолагам спадзявацца на адкрыццё тут новых старажытных

аб'ектаў — стаянак і паселішчаў ад каменнага веку да эпохі сярэднявечча. Папярэднія навуковыя даследаванні, якія праводзіліся ў 2005 г. у зоне рэканструкцыі Аўгустоўскага канала, пацвердзілі гэта. На 20 км беларускай часткі канала было знойдзена каля 50 разнастайных помнікаў археалогіі, выяўлена некалькі тысяч старажытных артэфактаў. Напрыклад, толькі каля в. Нямнова знойдзены комплекс з 4 старажытных паселішчаў. Яшчэ вялікая канцэнтрацыя помнікаў археалогіі маецца каля вёсак Усава (5 пунктаў), Дамброўка (6 пунктаў), Лясная (7 пунктаў), Чарток (8 пунктаў), Сонічы (11 пунктаў) [Абухоўскі, 2008, с. 131—148].

У цэлым, па колькасці толькі вядомых археалагічных помнікаў, якія складаюць значную частку гісторыка-культурнай спадчыны краіны ў цэлым, Аўгустоўскі канал, несумненна, займае адно з першых месцаў у Беларусі і нават суседніх краінах. На тэрыторыі Аўгустоўскага канала маюцца стаянкі каменнага, бронзавага вякоў, селішчы жалезнага веку і сярэднявечча, ўмацаваныя паселішчы, раскапаныя рэшткі жытлаў і гаспадарчых пабудоў, пахавальныя комплексы. Іх вывучэнне дазваляе характарызаваць усе этапы засялення рэгіёну ад з'яўлення ў басейне р. Чорная Ганьча, прытоку р. Нёман, першых людзей у фінальным палеаліце, да сярэдневякоўя і сучаснасці. Аднак большасць з помнікаў пакуль што застаюцца практычна невядомымі, недаступнымі для азнаямлення. Таму неабходная новая даўгачасовая комплексная праграма, накіраваная на значнае пашырэнне навуковых археалагічных даследаванняў, а таксама на шырокае практычнае выкарыстанне археалагічных помнікаў і матэрыялаў, у тым ліку і праз іх «музеефікацыю».

Мэту праекта можна сфармуляваць так: на базе разнастайнай гісторыка-культурнай (археалагічнай) спадчыны, якая захавалася на тэрыторыі Аўгустоўскага канала, распрацаваць канцэпцыю, стварыць і спрыяць пачатку працы «Археалагічнага музея пад адкрытым небам» — як асноўнай навукова-практычнай і турыстычнай «пляцоўкі» Гродзенскага рэгіёну.

Практычныя крокі рэалізацыі праекта могуць складацца як мінімум з 5 этапаў.

1. Працягнуць навуковае археалагічнае вывучэнне Аўгустоўскага канала і сумежных тэрыторый: правесці далейшае суцэльнае археалагічнае абследаванне рэгіёну і стварыць поўны «Рэестр археалагічных помнікаў Аўгустоўскага канала», ажыццявіць шыракамаштабныя стацыянарныя раскопкі шэрагу помнікаў археалогіі розных эпох, размешчаных у найбольш перспектыўных для ўключэння ў турыстычныя маршруты месцах, напрыклад каля вв. Нямнова, Дамброўка, Лясная, Усава. Пры гэтым адным з перспектыўных напрамкаў можа стаць удзел школьнікаў (старшакласнікаў) і студэнтаў у археалагічных даследаваннях на розначасовых помніках ў памежных раёнах Польшчы, Літвы і Беларусі.

2. Распрацаваць праекты аўтобусных і пешых турыстычных маршрутаў па тэрыторыі Аўгустоўскага канала з улікам наяўных археалагічных помнікаў. Напрыклад, «Па слядах першабытнага чалавека, паляўнічага і рыбалова», «Сцежкамі першабытнага рыбалова і паляўнічага», «Старажытныя промыслы: месцы па здабычы крамянёвай сыравіны» інш. Для гэтага трэба:

— стварыць відэа-і фота-дапаможнікі для экскурсаводаў і турыстаў з дэманстрацыяй асаблівасцяў жыццядзейнасці старажытных людзей у дадзеным рэгіёне на прыкладзе такіх помнікаў, стаянак і паселішчаў, як Нямнова, Лясная, Дамброўка і інш;

— распрацаваць макеты інфармацыйных. стэндаў на беларускай і англійскай мовах аб назве археалагічнага аб'екта і яго месцазнаходжанні; даціроўцы і культурнай прыналежнасці матэрыялаў, метадах і часе даследавання, асноўных знойдзеных матэрыялах;

— распрацаваць тэксты экскурсаў на беларускай, рускай і англійскай мовах і выкарыстоўваць іх у залежнасці ад складу наведвальнікаў, турыстаў.

3. Распрацаваць рэкамендацыі па стварэнні асобнай археалагічнай экспазіцыі ў існуючым музеі гісторыі Аўгустоўскага канала.

4. Распрацаваць рэкамендацыі па стварэнні на тэрыторыі Аўгустоўскага канала на плошчы археалагічнага помніка Нямнова 1 новага «Археалагічнага музея пад адкрытым небам». Гістарычныя рэканструкцыі («жывая археалогія») раскрыюць і выразна праілюструюць асаблівасці тапаграфіі і планіграфіі першабытных і старажытных паселішчаў, характар домабудаўніцтва, асаблівасці камнеапрацоўкі, ганчарства, ткацтва, металаапрацоўкі, разнастайных першабытных і сярэднявечных промыслаў.

5. Улічваючы своеасаблівасць і спецыфіку Аўгустоўскага канала, яго ўнікальнасць, прывабнасць як турыстычнага і навуковага аб'екта ў рамках будучага праекта мэтазгодна выкарыстоўваць дадзеную пляцоўку для пастаянна дзеючых праектаў па далейшай папулярызацыі археалагічных рэканструкцыі і мадэлявання. Акрамя таго, тут можна праводзіць навукова-практычныя археалагічныя канферэнцыі, напрыклад, міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Вынікі палявых археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі і суседніх рэгіёнаў» з удзелам як мінімум трох памежных краін Літвы, Польшчы і Беларусі, так і шэраг навучальных практычных семінараў для

мясцовай адміністрацыі, турыстычных фірмаў і экскурсаводаў «Археалагічнае спадчына Аўгустоўскага канала, яго ахова і значэнне», «Вопыт выкарыстання археалагічных помнікаў для развіцця турызму» «Гісторыка-культурная спадчына Гродзенскага рэгіёну і шляхі яе практычнага выкарыстання».

*Абухоўскі В. С.* Археалагічныя помнікі беларускай часткі Аўгустоўскага канала /В. С. Абухоўскі, В. Л. Лакіза // Августовский Канал и современый экотуризм. — Пултуск—Минск—Гродно, 2008. — С. 131—148.

*Белавежская пушча*: вытокі запаведнасці, гісторыя і сучаснасць /Нац.акад.навук Беларусі, Ін-т гісторыі; В.Г. Белявец [і інш.]; рэдкал.: А. А. Каваленя (старш.) [і інш.]. — Мінск: Беларус. Навука, 2009. — 455 с.

*Зямля сілы*. Белавежская пушча. Фотаальбом. — Мінск: «Бел.Энцыкл. ім. П. Броўкі», 2009.

*Лакиза В. Л.* Как увлечь историей / В. Л. Лакиза // Наука и инновации. — 2009. — № 6. — С. 20—22.

*Лакіза В. Л.* Археалагічная спадчына Белавежскай пушчы і магчымасці яе практычнага выкарыстання / В. Л. Лакиза // Беловежская пуща: история, природа, туризм: материалы междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 600-летию заповедности Беловежской пущи «Беловежская пуща: от лесничества до Национального парка» (Каменюки, 14 нояб. 2008 г.), «Беловежская пуща: история, природа, туризм» (Каменюки, 18—19 сентября 2009 г.) — Брест: Альтернатива, 2010. — С. 35—45.

*Borkowski W.* Krzemionki Opatowskie — rezerwat archeologiczno-przyrodniczy / W. Borkowski // Z otchłani wieków. — 2000. — Rocznik 55. — Nr. 1. — S. 10—17.

*Brzeziński W.* Parki archeologiczne jako forma prezentowania dziedzictwa archeologicznego / W. Brzeziński // Z otchłani wieków. — 2001. — Rocznik 56. — Nr. 1—2. — S. 112—115.

*Piotrowski W.* Muzeum Archeologiczne w Biskupinie / W. Piotrowski // Z otchłani wieków. — 2000. — Rocznik 55. — Nr. 1. — S. 20—27.

*Zalewski M.* Leśne rezerwaty przyrodniczo-archeologiczne na Podlasiu / M. Zalewski // Z otchłani wieków. — 2000. — Rocznik 55. — Nr. 1. — S. 18—19.

*В. Л. Л а к і з а*

## ПРО МОЖЛИВІСТЬ СТВОРЕННЯ НА ТЕРИТОРІЇ БІЛОРУСІ АРХЕОЛОГІЧНИХ МУЗЕЇВ ПІД ВІДКРИТИМ НЕБОМ

Ідея створення на території Білорусі археологічних музеїв під відкритим небом — доволі нове явище для археологічної науки та музейної справи країни. На жаль, до цього часу в Білорусі поки що не створено жодного такого музею. На сьогодні в Білорусі існують декілька унікальних археологічних комплексів які можуть бути використані для створення археологічних музеїв під відкритим небом.

На базі різноманітної історико-культурної спадщини, яка міститця на території Аугустовського каналу, можна розбудовувати концепцію, створювати та сприяти початку роботи «Археологічного музею під відкритим небом» — як основи науково-практичного та туристичного центру Гродзенського регіону.

*V. L a k i z a*

## THE POSSIBILITY OF CREATION ARCHAEOLOGICAL OPEN-AIR MUSEUMS IN BELARUS

The idea of creating archaeological open-air museums in Belarus is a rather new phenomenon for archaeological science and museums in the country. Unfortunately, by this time there are no such kind of museums in Belarus. In Belarus there are several unique archaeological complexes that can be used to create archaeological open-air museums. On the basis of various historical and cultural heritage of Auhustovsky channel, there is a possibility to develop a concept of creation an open-air archaeological museum as the basis of the Hrodzensky region research and tourist center.




*Мал. 1.* Лакалізацыя ўжо існуючых «археалагічных рэзерватаў» і скансэнаў, а таксама будучых археалагічных музеяў пад адкрытым небам на тэрыторыі Беларусі: *1* — Брэст – «Старажытнае Бярэсце»; *2* — Гродна – «Ніжняя царква»; *3* — Тураў – гісторыка-археалагічны комплекс «Старажытны Тураў» у Жыткавіцкім раёне; *4* — верхнепалеалітычная стаянка Юравічы ў Калінкавіцкім раёне; *5* — этнаграфічны музей народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах; *6* — музей валуноў у Мінску; *7* — в. Камянюкі на тэрыторыі НП «Белавежская пушча» у Камянецкім раёне; *8* — в. Нямнова на тэрыторыі Аўгустоўскага канала ў Гродзенскім раёне




*Мал. 2.* Праект будучага «Археалагічнага музея пад адкрытым небам» каля в. Камянюкі на тэрыторыі НП «Белавежская пушча»: *1* — тэрыторыя для рэканструкцыі пабудоў эпохі мезаліту; *2* — тэрыторыя паселішча Камянюкі 3 для рэканструкцыі вёскі бронзавага веку; *3, 5* — месца для аднаўлення першабытных культавых пабудоў; *4* — тэрыторыя паселішча Камянюкі 2 для рэканструкцыі вёскі эпохі позняга неаліту; *6* — тэрыторыя паселішча Камянюкі 1 для аднаўлення гарадзішча жалезнага веку; *7* — месцаразмяшчэнне будучага падворка жалезнага веку (пшэворскай культуры); *8* — месца для рэканструкцыі жылой пабудовы ранніх славян